Філалогія

УДК 808.26-54

А.М. Багамолава

Структурна-граматычнае выражэнне народна-паэтычнага эпітэта і яго функцыя ў баладных песнях

Беларуская народная паэтыка мае сістэму сродкаў выразнасці і вобразнасці мовы, якія выяўляюць стылёвую адметнасць розных фальклорных жанраў. У мове баладных песень, якія пабудаваны, як правіла, на канфліктах сямейнага характару, нават, калі ўпамінаюцца пэўныя гістарычныя падзеі, найбольш актыўна функцыянуе эпітэт. З дапамогай гэтага тропа ствараюцца такія непаўторныя і самабытныя вобразы балад, як *дачка-птушка, Ціхоня, сын-явар, нявестка-рабіна, Кузёмка, каралеўна Лявутанька* і інш.

Вядома, што народна-паэтычнаму эпітэту характэрна ўстойлівая сувязь з паясненым словам, узнаўляльнасць пры апісанні аднолькавых/падобных сітуацый, пры стварэнні тыповых/арыгінальных фальклорных вобразаў, а таксама пры перадачы пэўных эмоцый народа-творцы. У якасці традыцыйнага эпітэта ў песнях-баладах ужываюцца якасныя і адносныя прыметнікі як з прамым, так і з пераносным значэннем.

Якасныя прыметнікі з прамым значэннем забяспечваюць дакладную характарыстыку вобразаў, называюць галоўную, вызначальную рысу з'яў, прадметаў у канкрэтнай сітуацыі: ***Тонка*** *ліпка,* ***высокая,*** *На ёй лісце* ***шырокае*** [1, далей Б, I]; *Мая жонухна* ***маладая****. Ды пайшла яна ў крынічку Па* ***халоднёнькую*** *вадзічку* [2, далей Б, II]; *Пайшлі дзеўкі ў ягады, У* ***чырвоны*** *журавіны* (Б, II, 95); *Паехалі хлопцы а ўсе* ***маладыя****. Пад імі конікі* ***сівы, вараныя*** (Б, II, 93); *Мяды твае [жонухна]* ***салодкія*** *Парассычвала, Служак твaіх* ***вярненькіх*** *Парассылавала, Коней твaіх* ***варанёнькіх Пазавзджывала,*** *Шубы твае* ***дарагія*** *Пазанашвала* (Б, II, 365); *Сталі ночы* ***цёмныя****, Ўпалі снягі* ***белыя****. Ішлі дажджы* ***дробныя****, Цяклі рэчкі* ***быстрыя*** (Б, II, 497).

Некаторыя якасныя прыметнікі з прамым значэннем можна кваліфікаць як **таўтапагічную** разнавіднасць тропа: *Ой, хадзіла* ***малада малодка****. Да па чыстаму полю* (Б, I, 64); *Бачыў я* ***дзіва дзіўнюсенька****. Без сонца рабіна яснюсенька* (Б, I, 207); *А* ***малодка маладая*** *Загінула, жывучы за* ***худой худачынаю*** (Б, II, 412); *Мяне маць прапіла на* ***салодкім мяду*** *Данілушку-купцу* (Б, II, 255); *Відаў* ***дзіву дзіўную, чуду чудную*** (Б, I, 155); *Пойдзем, сястра, у лес у* ***чорныя****. У* ***чорныя****, у* ***чорныя****, у* ***чарнічанькі****...*(Б, II, 257); *Упалі снягі* ***белыя*** (Б, II, 497); ***Раса*** *мая* ***расістая****, І эй,* ***раса*** *мая* ***расістая*** (Б, II, 51).

Відавочна, што **таўталагічны эпітэт** разам з паяснёным словам утварае характарыстычнае словазлучэнне. Праз паўтор якасці, якая заключаецца ў назыўным значэнні прадмета, канкрэтызуюцца адзнакі вобраза, асабліва важныя для ўспрыняцця сітуацыі або зместу ўсяго твора.

Эпітэты – адносныя прыметнікі, – ужытыя з прамым значэннем, дазваляюць ідэалізаваць рэальнасць або ўдакладніць пэўныя характарыстыкі: *Што наша ціхоня зрабіла:* ***Шаўковую*** *ленту згубіла* (Б, I, 379); *Злота маніста*

знойдзецца і ***залатыя*** *каралі, І* ***срэбныя*** *пярсцёнкі* (Б, І, 379); *Паставіла* ***вядзеркі*** *на бруску,* ***Замшовыя*** *чаравічкі – на пяску* (Б, І, 387); *Аднаму дала* ***шаўковы*** *платок, Другому дала* ***залаты*** *пярсцёнак* (Б, І, 177); *А ў садочку, у садочку Стаіць студня* ***кленавая*** (Б, І, 159); *Ой, сяду я, пайду ў* ***вішнёвым*** *саду* (Б, І, 64).

Экспрэсія эпітэтаў-прыметнікаў з прамым значэннем узмацняецца ў антытэзе пры супастаўленні з'яў, паняццяў, якія выўляюць супрацьлеглыя адносіны, паводзіны асобы ў аднолькавай сітуацыі: *Паставіла сыну* ***салодкага*** *мёду, Маладой нявестцы –* ***халодную*** *воду* (Б, І, 455); *Пасадзілі сыну* ***чырвону*** *каліну, Маладой нявестцы –* ***сухую*** *яліну* (Б, І, 450); *Сына спаткала з* ***чырвоным*** *віном, А нявестачку – з* ***горкай*** *атрутай* (Б, І, 526); *Сына убрала ў* ***тонкую*** *кітайку, А нявестку – у* ***тоўстую*** *рагожу* (Б, І, 471); *Ты ў мамы хадзіла ў лапціках* ***ліпавых****, А ў нас будзеш хадзіці ў чаравічках* ***новых*** (Б, II, 210).

Як бачым, эпітэты-прыметнікі ў складзе антытэзы дапамагаюць «абвастрыць» пачуцці, а таксама забяспечваюць творам глыбокі падтэкст.

Эпітэты – якасныя і адносныя прыметнікі з пераносным значэннем у мове балад менш прадуктыўныя, аднак менавіта **метафарычная разнавіднасць тропа** дазваляе гаварыць пра спецыфіку народных асацыяцый, пра арыгінальную вобразнасць фальклорных твораў: *Мяне матка ў* ***злую*** *пару на свет радзіла* (Б, І, 64); *Ці не відзелі варанога каня, Варанога каня,* ***белага*** *малайца* (Б, І, 152); *Ты [явар] цяпер зялён, харош, Прыйдзе к табе* ***люты*** *мароз* (Б, І, 317); *Я думала, што кароўка рычыць --* ***Ліха*** *доля пад акенкам крычыць* (Б, І, 595); *Як ушыблі ж* ***ліхія*** *гадочкі, Пусціліся ды дробныя дзеткі* (Б, І, 595); *... Я ўвесь свет прайшоў, Нідзе такой рабіначкі* ***жаркай*** *не знайшоў* (Б, І, 191); *Да ў нас паля* ***грашовыя****, Да ў нас рэчкі* ***мядовыя****, Да ў нас росы* ***цукровыя****, Да ў нас масты* ***залатыя*** (Б, І, 219); *А ў нас поле* ***залатое****, А рэчкі* ***медавыя*** (Б, І, 222); *А з поўначы бяроза зашумела,* ***Залатое*** *лісціка яе зазвінела* (Б, І, 156); *Твае коні на дуброве ядуць траву* ***шаўковую*** (Б, І, 656).

Метафарычныя **эпітэты** ў кантэксце балад, як відаць з прыведзеных прыкладаў, часам гіпербалізуюць якасці, уласцівасці прадметаў, з'яў. Вядома, гіпербалу нельга разумець літаральна, але гэты троп дазваляе ўявіць праз нерэальнасць/немагчымасць з'яў, уласцівасцей іх рэальнае ўспрыманне аўтарам, глыбіню яго пачуцця: *Як там цякуць рэчкі* ***крывавыя****, І ручайкі цякуць* ***слезавыя****, Як там масты мосцяць* ***трупавыя*** (Б, II, 13).

Ужыванне эпітэтаў з гіпербалізаваным зместам вынікае з самога баладнага жанру, якому ўласцівы «элементы цудоўнага і звышнатуральнага», «глыбокі псіхалагізм» [3]. Можна ўявіць, якое ж багацце і дастатак там, дзе цэлыя палі грошаў, дзе рэчкі, поўныя мёду, а росы – з цукру і г.д., і наадварот, якое гора-бяда там, дзе рэчкі, поўныя крыві, ручаі – слёз, масты з трупаў.

У баладах, як і ў іншых фальклорных паэтычных творах, эпітэты-прыметнікі ўжываюцца не толькі ў поўнай, але і ў кароткай, і ва ўсечанай формах, што абумоўлена рытмам, рыфмай, мелодыяй песеннага радка: *А вазьмі ты мае гора, Завязі яго ў* ***чыста*** *поле* (Б, II, 93); *Што на тым пяску Стаіць подачка* ***нава****, Вісіць лента* ***галуба*** (Б, II, 382); *Па полечку* ***бел*** *малойчык паязджае* (Б, II, 91); *А ў полі-полі а* ***сыр*** *дуб стаіць, А на тым дубу* ***сыз*** *арол сядзіць* (Б, І, 582); *Твой жа брацец, ён забіты ляжыць,* ***Белы*** *ножанькі к дарожаньцы* (Б, І, 148); *У чыстым полі снег ідзець, Зямлю* ***сыру*** *прыкрываець* (Б, II, 12); *Выйду на* ***высоку*** *горку, Ой гляну пад* ***ясну*** *зорку* (Б, II, 225); *– Будзеш, купчык, тут начаваці,* ***Яркі*** *кастры раскладаці,* ***Смачну*** *вячэру гатаваці,* ***Мякку*** *пасцелю засцілаці* (Б, II, 428).

У параўнанні з мовай мастацкай літаратуры, дзе ўжыванне эпітэтаў-прыметнікаў у кароткай і ўсечанай формах абмежаванае, у мове народна-паэтычных твораў такія формы тропа з'яўляюцца традыцыйным сродкам выражэння думак і пачуццяў.

Стылёвая адметнасць беларускіх народных песень – ужыванне эпітэтаў-прыметнікаў з суфіксамі суб'ектнай ацэнкі [4]. У баладах яны функцыянуюць з большай *(-усеньк-/-юсеньк-, -есеньк-, -ічаньк-, -уленьк-, -оханьк-/-еханьк-, -ушч-/-юшч-/яшч-)*, або меншай *(-эньк-/-еньк-/-аньк-)* ступенню ацэначнасці, экспрэсіўнасці ў адпаведнасці з сітуацыяй, з ідэйна-эмацыянальным зместам канкрэтнага твора. У выніку ўзнікаюць варыянты эпітэтаў, прычым канатацыйны эфект іх адваротна прапарцыянальны частотнасці ўжывання: *Жонушка мужа да й пераймала З* ***беленькім*** *сырам, з* ***маленькім*** *сынам* (Б, II, 55); *Што казак* ***харошанькі****, Што казак* ***прыгожанькі*** *Думаў рэчку перайсці* (Б, II, 99); *Хадзіў, блудзіў* ***беленькі*** *малойчык На* ***крутой*** *гарэ* (Б, II, 110); *Дунаёк мой* ***ціхусенькі****, Што ты стаіш* ***мутнюсенькі*** (Б, II, 13); *Не плачце, дзеткі* ***малюсенькія****, Пастаўлю хатку* ***навюсенькую****, Вазьму вам мамку* ***маладзюсенькую*** (Б, II, 261); *Глазкі мае* ***чарнесенькі****, чом не смотрыце?.. Дзеткі мае* ***малесенькі****, чом не плачыце* (Б, I, 562); *Цячэ рэчанька* ***невялічанька****. Скочу -- пераскочу* (Б, I, 102); *Пакінуў табе пару коні* ***вараненькіх****, Пару валоў* ***сівуленькіх*** (Б, I, 160); *Стаіць каліна далінаю, Без сонца яна* ***краснёханька****, Без ветру яна калышацца, Без дожджыку ўся* ***макроханька*** (Б, I, 198); *Раны свае* ***балюшчыя*** *Пераверчывае [уланік]* (Б, II, 283); *Вочкі мае* ***відушчыя****, Чаму не відзіце? Ручкі мае* ***рабляшчыя****, Чаго не робіце?* (Б, I, 558).

Такія эпітэты-прыметнікі з'яўляюцца трапным, эканомным сродкам стварэння вобразнасці і выразнасці, паколькі ацэначны фармант выконвае падвойную функцыю: з аднаго боку, ён выражае суб'ектыўную/аб'ектыўную ацэнку якасці, ступень яе праяўлення, а з другога, праз яго аўтар выражае эмоцыі. Некаторыя з прыведзеных эпітэтаў з'яўляюцца рэдкаснымі, адзінкавымі ўтварэннямі, не ўласцівымі ні літаратурнай, ні дыялектнай мове. Думаецца, такія вобразныя азначэнні – **аказіянальная разнавіднасць народна-паэтычнага тропа**: сівуленькія валы.

Значэнне высокай меры якасці, блізкай да найвышэйшай ступені [5], надаюць эпітэтам-прыметнікам у кантэксце балад не толькі суфіксы, але і такія прыстаўкі, як *раз- / раза-, пры-, пра -*: *А стань жа ты ў полечку, стань былінаю, Тонкаю, высокаю,* ***распрыўдалаю*** (Б, I, 228); *Салавей, салавей,* ***Развясёлая*** *пташачка* (Б, I, 597); *Ён не хоча з ёю жыць,* ***Распраклятае*** *любіць* (Б, I, 601); *Ты свякрухна мая, Ты –* ***пралютая*** *змяя* (Б, I, 586); *Ты свякруха мая,* ***разазлюшчая*** *змяя* (Б, I, 590); *Галоўка мая* ***прабедная****! Куды я пайду -- Бог долі не даў* (Б, II, 51); *Тонкая [былінанька], высокая, шчэ й* ***прыўдалая*** (Б, I, 242);

Прыстаўкі *пры-, пра-* не ўласцівыя літаратурнай мове, аднак у фальклорных тэкстах яны з'яўляюцца адным з традыцыйных сродкаў выражэння аўтарскіх ацэнак, эмоцый.

Адметнасцю мовы песень-балад з'яўляецца ўжыванне эпітэта-прыметніка ў форме элятыва, праз якую перадаецца гранічная (як правіла, самая высокая) ступень якасці і гранічнае праяўленне эмоцыі аўтара / апавядальніка: – *Падай, мамка,* ***найвастрэйшу*** *шаблю, Я паеду к Марусі ў вяселле* (Б, II, 165); *Пайду да стайні да й да новае, Выберу каня* ***найсівейшага*** (Б, II, 519); – *Выпі, братка, бо ты старшы, У маём сэрцы* ***найкаханшы*** (Б, II, 529); – *Выпі, сястра, бо ты мнейша, У маём сэрцы* ***наймілейша*** (Б, II, 529); *Служанькі мае* ***найвярнейшы****, Закладайце конікі, што* ***найлепшы*** (Б, I, 545); *Да выбер сякерачку* ***найгастрэйшую****, Да зрубай былінаку* ***найкраснейшую*** (Б, I, 229); – *Выйдзі,* ***найстарэйша*** *сястра, нясі хустку, Нясі хустку што* ***найлепшую,***

Найлепшую, найбялейшую (Б, II, 16); – *Выйдзі, выйдзі,* ***найстарэйшы*** *браток, Вядзі каня што* ***найлепшага, Найлепшага, найсільнейшага*** (Б, II, 16).

Дзякуючы сваёй семантыцы і экспрэсіўнасці эпітэт-злятыў ужываецца для апісання самых драматычных, трагічных падзей: напрыклад, свякроў заклінае нявестку ў быліну, таполю ці інш. і загадвае сыну ссячы яе.

Рэдкасныя ў мове баладных песень эпітэты – складаныя прыметнікі рознай структуры, паколькі іх «трэба лічыць больш познімі ўтварэннямі» [6].

Да першай групы адносяцца тропы, утвораныя пры спалучэнні ў адно цэлае назоўніка з прыметнікам: – *Ах ты, косю* ***белагрывы****, Скажы, скажы, дзе мой міпы* (Б, II, 49); *Як ты [рэчушка] майго мілага, дружка* ***чарнабрывага*** *З свету белага звяла* (Б, II, 99); *А ты міленькі,* ***сізакрыленькі*** *орля, Што не бі мяне а ў галовачку больна* (Б, II, 473); *Ой, коню мой, коню* ***жаўтагрывы*** (Б, I, 607). *Жанісь, жанісь, міленькі, Жанісь* ***чарнабрывенькі*** (Б, I, 134).

Другую групу складаюць эпітэты, утвораныя шляхам спалучэння аднакаранёвых прыметнікаў: *Мамулька* ***стара-старусенька****, Сястрыца* ***мала-малюсенька****, Жонка* ***млода-маладзюсенька****, Як пайшла ў Дунай па вадзіцу* (Б, II, 86).

Да трэцяй групы належаць эпітэты, выражаныя спалучэннем сінанімічных прыметнікаў. У такім выпадку дзве блізкія ці нават тоесныя прыметы зліваюцца ў адно слова-характарыстыку: *Як мачысе гадзілі,* ***Голы-босы*** *хадзілі* (Б, I, 262); – *Ой, старшую везлі ў чырвоным убранні, А сярэднюю везлі ў зяленым жупане, А найменшую везлі* ***голеньку – нагеньку*** (Б, II, 74).

Чацвёртая група – эпітэты, якія называюць сэнсава розныя ўласцівасці аднаго і таго ж прадмета, у выніку чаго вобраз атрымлівае падвойную характарыстыку: *Узбудзі,* ***бел-кудрава*** *[бяроза] заўтра рана* (Б, I, 157).

Вядома, што складаныя прыметнікі выступаюць у ролі **злітных (двайных) эпітэтаў,** сутнасць якіх у прыведзеных прыкладах у тым, каб вылучыць пэўную якасць / якасці і ўзмацніць рознымі спосабамі. Варта адзначыць, што адметнасцю мовы фальклорных твораў, у тым ліку і балад, з'яўляецца ўжыванне складаных прыметнікаў з суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі (*сізакрыленькі, чарнабрывенькі*), што не ўласціва літаратурнай мове.

У ролі эпітэтаў у баладных песнях могуць ужывацца назоўнікі, прыдаткі, якія «ў адрозненне ад дапасаванага азначэння-прыметніка, выражаюць прымету прадмета праз адносіны да яго прадмета, названага самім прыдаткам» [7]: *Была ў маткі адна дачка, Адна дачка –* ***работначка*** (Б, II, 98); *Што чужыя да харошыя, як розавы цвет, Над мае шэльмы-****няўдашачкі*** *ў белым свеце нет* (Б, II, 446); *Як стаў жа казачэнька Да ножык тачыці, Яго жонка-****галубка*** *Пачала прасіці* (Б, II, 480); – *Ой, сыночкі-****саколікі****, Асядлайце пара каней* (Б, II, 543); *А на вуліцы скрыпкі да дудкі, А там гулялі дзеўкі-****галубкі*** (Б, I, 495); *Ажно мая матачка па сенях ходзіць, Нявестачак-****ластачак*** *абуджаючы* (Б, I, 64); *Дзяўчыначка-****журавіначка****, Загадаем табе сем загадак* (Б, I, 658); *Замуж вышла за купчыка, За купчыка-****галубчыка*** (Б, I, 430).

Прыведзеныя эпітэты кваліфікуюцца як **эпітэты-прыдаткі**, якія з'яўляюцца дакладным, лаканічным і эмацыянальным сродкам стварэння вобразаў. Народна-паэтычнаму эпітэту-прыдатку ўласціва памяншальна-ласкальная форма, якая ў кантэксце балад перадае як станоўчыя (дачка-работначка, купчык-галубчык), так і негатыўныя (шэльма-няўдашачка) адносіны апавядальніка / аўтара да асобы.

Аналіз мовы баладных песень паказвае, што народна-паэтычны эпітэт з'яўляецца прадуктыўным моўна-выяўленчым сродкам і вызначаецца разнастайнасцю формаў выражэння, а гэта значыць, што ён прадстаўлены ў аналізуемым жанры рознымі відамі гэтага тропа.

ЛІТАРАТУРА

1. ***Балады*** / Уклад. ***Л.М. Салавей***. У 2 кн. Мн., 1977. Кн. I. С.159.
2. ***Балады*** / Уклад. ***Л.М. Салавей***. У 2 кн. Мн., 1978. Кн. II. С. 90.
3. ***Беларуская вусна-паэтычная творчасць*** / ***Кабашнікаў К.П., Фядосік А.С., Ліс А.С. і інш***. Мн., 1988. С. 309.
4. ***Бааамолава А.*** Вобразнае слова беларускіх народных песень // Адукацыя і выхаванне, 1994, № 12. С. 65.
5. **Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы** / Пад рэд. ***М.Р. Судніка, М.Н. Крыўко***. Мн., 1996. С. 334.
6. ***Плавіч Н.С.*** Паэтыка беларускай народнай лірыкі. Мн., 1975. С. 31.
7. ***Гаўрош Н.В.*** Слоўнік эпітэтаў беларускай мовы. Мн., 1998. С. 7.

SUMMARY

The analysis of the songs-ballads language shows that the folk-poetic epithet is a productive figurative means and is determined by a variety of the forms of expression. It means that different kinds of the epithet are submithed in the analyzed genre.

Поступила в редакцию 24.01.2002